Моваю душы

## Настасся НАРЭЙКА:

# «Я КРОЧУ ПА ЧАСЕ, НІБЫ ПА ВАДЗЕ...»

**Трымаю ў руках зборнік вершаў маладой паэткі Настассі Нарэйкі, якую нядаўна прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Пазнаёміўшыся з яе творчасцю, я адчула роднасную душу, таму што і сама з дзяцінства люблю пісаць — апавяданні, казкі і вершы. Яшчэ мару, як і яна, стаць журналісткай. У Камянец Насця трапіла пасля размеркавання, а нарадзілася ў Маладзечне, скончыла гімназію №10, у якой зараз вучуся і я. Нядаўна мне пашчасціла пазнаёміцца і пагутарыць са сваёй зямлячкай.**



— Я пачала пісаць з дзесяцігадовага ўзросту. Памятаю, мне падабалася чытаць творы беларускай літаратуры, а потым я вырашыла паспрабаваць складаць вершы сама. Але запісвала іх чамусьці ў радок, як звычайны празаічны тэкст. Потым трапіла ў літаратурны гурток, і мне там растлумачылі, што вершы пішуцца не так. Першы мой верш быў прысвечаны Беларусі, а першай чытачкай і слухачкай была мама. Яна паслухала і спытала: «Гэта ты сама?» Напэўна, усе бацькі так пытаюцца...

Не ведаю, чаму, але цяпер мяне цікавіць тэма ўзаемаадносін чалавека з Богам. І я спрабую праз вершы з ім гутарыць.

***— У вас выйшаў першы зборнік...***

— Гады два таму Брэсцкае аддзяленне Саюза пісьменнікаў аб'явіла ў вобласці літаратурны конкурс. Пасля ўдзелу ў ім мяне запрасілі на свята «Лунінецкая восень» і прапанавалі выдаць зборнік вершаў. Я марыла пра ўласную кнігу вельмі даўно, а вось калі выпала такая магчымасць, чамусьці доўга сумнявалася. Шмат разоў перачытвала, нешта выкідала, нешта дадавала. Зборнік называецца «Магдэбургскае права маёй душы». Гэта амаль сугучна з назвай аднаго з вершаў. Кніга прысвечана ўнутранай свабодзе чалавека, праву яго душы на «самакіраванне».

**Я знайшла сабе новы дэвіз, радкі з твора Караткевіча. Ён гучыць так: «Чалавек народжаны для бітвы і мае права памерці толькі ў бітве».**

***— Вы пішаце толькі па-беларуску?***

— Я вучылася ў беларускамоўнай школе, і дома мы размаўляем на роднай мове. Потым, калі я паступіла ў Інстытут журналістыкі, у нас на курсе была выкладчыца Альбіна Рышардаўна Хрумчанка, якая таксама выкладала ўсе прадметы па-беларуску. Гэта такі чалавек, што пасля яе заняткаў грэх не гаварыць на роднай мове!

***— Як да вас прыходзіць натхненне? Вы больш паэтка ці журналіст?***

— Звычайна для таго, каб яно прыйшло, патрэбны новыя людзі, уражанні, сустрэчы. А што тычыцца журналістыкі... Напэўна, я і першае, і другое, а яшчэ я трошкі празаік: пішу апавяданні. Гэта ў чымсьці падобныя прафесіі. Бывае так, што прыязджаеш да чалавека, ён расказвае сваю гісторыю, а ты слухаеш — і не можаш паверыць. Хоць серыял здымай! Але ён просіць не пісаць пра гэта ў газеце. Тады прашу дазволу напісаць апавяданне, змяніўшы імёны герояў.

***— Чым займаецеся ў вольны час?***

— Вяду гурток па журналістыцы ў аддзяленні дзённага знаходжання для людзей пажылога ўзросту пры мясцовым Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Расказваю пра тое, як трэба пісаць, як браць інтэрв'ю. Мы нават запісвалі на тэлефон радыёперадачу. Ёсць пенсіянеры, якія сапраўды ў гэтым зацікаўлены. Напрыклад, адна жанчына схадзіла аднойчы на канцэрт і ўжо на наступны дзень падрыхтавала заметку. Яна вельмі добра піша. Увогуле, з імі цікава, яны шмат ведаюць. Спачатку баялася, што не змагу знайсці з імі агульную мову, але нам заўсёды ёсць пра што пагаварыць.

Па вечарах я абавязкова звяртаюся да свайго дзённіка. Праводжу над ім ад некалькіх хвілін да некалькіх гадзін, у залежнасці ад таго, як прайшоў дзень. Дарэчы, калі не здарылася нічога асаблівага, запоўненых за адзін раз старонак чамусьці атрымліваецца больш. Я туды пішу не толькі пра тое, што адбылося, але і запісваю розныя свае ідэі. А потым з гэтага можа атрымацца апавяданне.

***— А не было жадання весці інтэрнэт-дзённік ці блог, як гэта цяпер многія робяць?***

— Для мяне галоўнае — рух рукі. Вершы і апавяданні спярша пішу толькі на паперы. Магчыма, справа ў тым, што калі друкуеш на камп'ютары, то можаш выправіць нешта ў любы момант, а на паперы гэта рабіць у нейкім сэнсе больш складана — таму ўзрастае адказнасць.

***— Як бы вы сябе коратка ахарактарызавалі? Які ў вас дэвіз па жыцці?***

— Я наіўная, напэўна. Думаю, гэтая рыса карысная для паэта і пісьменніка. Яшчэ рамантычная. Гэтая якасць таксама часам дапамагае. І адданая. Рабоце, Радзіме, справе, якая ў мяне ёсць.

Калісьці ў школьныя гады я пісала ліст для газеты «Раніца». Трэба было расказаць пра сябе і прывесці свой жыццёвы дэвіз. Тады я выбрала радкі Маякоўскага «Светить всегда, светить везде!». Мне здавалася, што ў гэтых словах ёсць нейкі дух бунтарства, характэрны для моладзі. А цяпер у мяне крыху змяніліся арыенціры. Я знайшла сабе новы дэвіз, радкі з твора Караткевіча. Ён гучыць так: «Чалавек народжаны для бітвы і мае права памерці толькі ў бітве». Увогуле, у Караткевіча ёсць кніга «Нельга забыць», якая цалкам можа стаць маім дэвізам.

***— Што б параілі будучым журналістам?***

— Вопыту трэба набірацца як мага раней. Мяркую, што калі б я не прыйшла некалі ў гурток па журналістыцы пры тагачасным Маладзечанскім цэнтры пазашкольнай работы, то не мела б столькі публікацый да паступлення. А калі вам патрэбна тэма для артыкула, часцей сустракайцеся з людзьмі. У іх могуць быць самыя незвычайныя лёсы...

**Дар'я СВІРЫДА, выпускніца 10 класа гімназіі №10 г. Маладзечна. Фота аўтара.**

### Уладзіміру Караткевічу

*Ісці па галіне, якая спружыніць і гнецца*
*Пад нагамі. А неба ўсюды: звонку, унутры.*
*Ісці, і баяцца, і ведаць, што сэрца сарвецца,*
*Як яблык з галіны, і стукнецца вобзем: памры!*

*Ісці па галіне. Нячутна ў цемры гайдацца.*
*Зоры хаваць на грудзях, каб апёкі навек.*
*У гэтай вадзе, што ідзе, без канца люстравацца.*
*І ведаць, што свет нерэальны прыгожы, як здзек.*

*Ісці па галіне. Цемрай у коле святла.*
*Потым сарвацца і плыць, і ўліцца ў траву.*
*І чуць, і не верыць, і ведаць... Удары вясла.*
*Мроіцца толькі. Я дыхаю, веру, жыву.*

*Галіна звініць, бы струна. Аддаецца ў вушах.*
*Ноч адклікае назад свае чорныя войскі.*
*Знічкай сарвецца надзея. І сціпшыца жах.*
*Ляжаць, і маўчаць, і глядзець у сябе, як Загорскі.*

*Галіна кранецца гарачага злітка сонца.*
*Будзе рака свае воды ў неба нясці.*
*Устану. Пайду. Шчаслівая страшна, бясконца.*
*І будзе з душы маёй новае дрэва расці.*

### Магдэбургскае права тваёй душы

*Ты не лічышся нават са мной.*
*Ты смяешся і робіш, як хочаш.*
*Я забыла пра сон і спакой,*
*Бо штурмую цябе дні і ночы.*

*Ты расстаўляй па вежах салдат,*
*А твой мост пад'язны, як прыбіты.*
*Не зраблю я і кроку назад.*
*Не чакай. Мы з табою спавіты.*

*Не жадаеш і слухаць мяне?*
*Мой адчай. Мой кароль ашалелы.*
*Не кахаеш? То гэта міне.*
*І ляцяць легкакрылыя стрэлы.*

*Апушчу, як у сне, арбалет.*
*Мне нашто заваёўніцы слава?*
*За цябе я аддам цэлы свет.*
*Клята будзь, магдэбургскае права!*

***

*Каласы, камяні і крыніцы...*
*Карагод, крыгаход, краявід...*
*За цябе я баюся маліцца,*
*Бо растанеш, як белы прывід.*

*Мова-казка і мова-загадка,*
*Разам з тым мова-крык, мова-боль,*
*Між любоўю і вечнасцю кладка,*
*Наш адвечны, забыты пароль.*

*Ты ж жывая! Згадаць нас прымусь!*
*Вер: не знікнеш, не згінеш дарэмна.*
*— Каго любіш?*
*— Люблю Беларусь.*
*— Божа мілы, як гэта ўзаемна!*

Друкуецца ў «Маладосці»

**Першыя свядомыя спробы пяра Дзмітрый Шулюк зрабіў у сёмым класе, але тады не атрымаў ніякай падтрымкі. Сапраўдным матыватарам для яго стаў малодшы брат Саша, для якога былі напісаны першыя казкі. Дзмітрый марыць, каб яго творы былі вечнымі і сапраўднымі і каб яны сталі для кагосьці кавалкам чыстага неба над галавой.**



Дзмітрый ШУЛЮК

## ПАЛЁТ

Гусак марыў пра нябёсы. Марыў з самага дзяцінства. З таго далёкага дня, калі ён, задраўшы дзюбу ўгору, прыгледзеўся і яму здалося, што там, у аблоках, ляцяць роўным ланцужком гусі. Хутчэй за ўсё, здалося, бо гусі не могуць лётаць. Гусі вельмі цяжкія. Іншая справа — вераб'і. Маленькія, шпаркія птушкі. Ім не трэба шмат сіл, каб узняцца ў паветра. Не трэба шмат сіл, каб заставацца з ім. Але ж кожнаму — сваё. Адны могуць лётаць, затое другія — могуць есці ўволю. І ўсё жыццё гусаку даказвалі, што тыя, другія, больш шчаслівыя за першых. Гусак сумняваўся, гусак не мог паверыць. Ён думаў, што яшчэ малады і таму ў яго такія думкі. Такія мары. Таму ў яго такія казачныя сны.

Сны. Астатнія гусі не бачылі сноў. І гусак не мог растлумачыць ім гэтую з'яву. Колькі б ён ні падбіраў словы, атрымлівалася, што ён проста хворы. Што менавіта хвароба і туманіць яго розум. Менавіта яна не дае яму радавацца жыццю.

Старэйшыя гусі (не нашмат старэйшыя, бо да старасці гусі не дажывалі — зніклі кудысьці) спрабавалі дапамагчы хвораму гусаку-рамантыку. Але не спраўляліся. Яго аднагодкі смяяліся з яго. А малых гусянят да дзівака не падпускалі, каб не сапсаваў. Вось так жыццё і ішло.

Пакуль аднойчы ўсё не змяніў адзін сон. Гусак зноў бачыў сябе ў небе. Ён зноў лётаў. Бачыў увесь свет інакш, увесь свет без межаў, увесь свет свабодным. Ён дыхаў гэтай свабодай, ён быў шчаслівым. Пакуль не пабачыў яе. Тую, якую кахаў. Яна не ляцела з ім. І ніколі б не паляцела. Для яе гэта было так незразумела, так дзіка, што нават у сне гусак не ўяўляў яе побач з сабой. Да гэтага самага сну зусім не ўяўляў. А цяпер уявіў. Убачыў яе, такую далёкую, бессэнсоўную белую пляму. Убачыў і спужаўся. Спужаўся, што не вернецца да яе. Спужаўся, што з кожным яго палётам адлегласць паміж імі становіцца ўсё большай. Спужаўся, што ім не быць разам. І забыўся, як лётаць. Без усякага толку махаў крыламі, але яны перасталі трымаць цяжкае гусінае цела ў паветры. Яны сталі бескарыснымі прыдаткамі па баках. Неба адмовілася ад гусака, адмовілася на карысць зямлі.

Гусак прачнуўся зусім іншым. Не такім, якім быў вечарам. Ён больш не хацеў лётаць, баяўся. Кожны дзень гэты страх адкусваў кавалкі ад былой мары, пакуль мара зусім не знікла. І гусак стаў шчаслівым. Шчаслівы ён еў уволю, гагатаў з дурных вераб'ёў. І шчаслівы падставіў шыю пад сякеру...



**Эмілія Комар нарадзілася ў 1993 годзе, вучыцца на журналіста ў ГрДУ імя Янкі Купалы, захапляецца адзінаборствамі, натхняецца падарожжамі і загартоўваецца маржаваннем. У «Маладосці» дэбютуе маленькімі апавяданнямі, адно з якіх прапануецца чытачам «Чырвонкі».**

Эмілія КОМАР

## ГРУШКА

Скрыўленая на бок хата стаяла адна, нібы пакінутая сіротка, на ўзлессі, за некалькі соцень метраў ад невялікай вёскі. Маленькая, са старых бярвёнаў, яна дажывала свой доўгі век як пустэльніца, адна-адзінюткая. Яе гаспадыня, такая ж старая і ўсімі забытая бабуля, жыла ў ёй больш за паўсотню гадоў. Дзеці параз'язджаліся па свеце, а з былой гаспадаркі толькі і засталіся, што пара курэй ды кволы стары певень. Гарода ўжо некалькі гадоў не трымала, бо на тое не было колішніх сіл. І толькі ля самай хаціны стаяла грушка — адзіная родная душа бабулі. Яна кожнае лета давала добры ўраджай смачных пладоў. На лавачцы каля грушкі старая і праводзіла амаль увесь свой час, седзячы ды нешта гаворачы гэтаму дрэву. Часта паглядала на верхавіну ды цяжка ўздыхала. Грушка была для яе даражэйшай за ўсё. Здавалася, яна лавіла і разумела кожнае слова старой, а ў адказ часам шапацела лісцем...

...У вёсцы бабулю інакш, як чараўніцай або вядзьмаркай, не звалі; ніхто нават дакладна не памятаў яе імя. Чамусьці лічылася, што яна займаецца рознымі чарамі, знарок накладае праклёны, наводзяць псоту... Таму ягады і грыбы мясцовыя ў тым баку не збіралі, бо лічылі іх сапсаванымі, ядавітымі. Да хаты старой ніхто не набліжаўся, а калі бабуля выходзіла да аўтакрамы, што прыязджала ў вёску два разы на тыдзень, то яе абыходзілі бокам, цураліся. І толькі адзін чалавек, прадавец гэтай крамы, вітаўся з бабуляй, гаварыў ветліва і проста. Раней, калі была яна крыху маладзейшай, аднавяскоўцы заўсёды імкнуліся яе абразіць, зняважалі, хаця і пабойваліся. Цяпер усе неяк звыкліся, не так звярталі ўвагу, проста моўчкі не любілі, а былі і такія, хто адкрыта ненавідзеў, думаючы, што прычынай усіх вясковых няшчасцяў была яна, вядзьмарка...

Ніводзін чалавек не памятаў, што быў час, калі яна ратавала хворых, дапамагала цяжарным, лячыла свойскую скаціну, збірала травы, сушыла, рабіла з іх лекі і аддавала ўсім, хто прасіў... Не памятаў ніхто і пра тое, што на вайне загінуў муж, што дзеці даўно выракліся роднай хаты і павыязджалі хто куды, забыўшыся на свае карані, на маці, зямлю... Людзі памяталі толькі адно: нібыта яна забіла дзіця. Хоць ніхто дакладна не ведаў, як тое было, ніхто не здагадваўся, што дзіця памерла, не нарадзіўшыся, таму што меўся толькі такі выбар: альбо загіне маці, якая павінна была нарадзіць, або дзіця, якое мусіла нарадзіцца... Старая пакінула ў жывых жанчыну, бо ў той было яшчэ чацвёра, якіх гадавала адна, без мужа... Ніхто не ведаў, але ўсе гаварылі і праклінаў...

...На пачатку восені, калі надышла пара збіраць садавіну, вясковыя дзеці залезлі на бабуліну грушку, абламалі сукі, паабтрасалі ўсё, пазбіралі грушкі, зламалі лаўку, што стаяла побач, разбілі маленькае акенца ў сенцах ды паразбягаліся. Для іх гэта была забава, нядобрая, але ўсяго толькі забава. А бабуля...

...У чацвер, як заўсёды, прыехала аўтакрама. Добры дзядзька Мар'ян, прадавец, не заўважыўшы старой, запытаўся пра яе ў вяскоўцаў... У адказ прагучала незадаволенае:

— Дык памерла старая, няма больш. Яшчэ і грошы з нас збіралі, каб іх чэрці, на пахаванне...

Вясной грушка не зацвіла...